# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі ДЗІГАДЗЮК Валянціны Паўлаўны «Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Даследаванне мастацкага тэксту з'яўляецца актуальным для сучаснай лінгвістыкі, для бачання тэндэнцый і заканамернасцей развіцця моўных працэсаў і абумоўлена неабходнасцю вывучэння мовы мастацкай літаратуры, сродкаў і спосабаў рэпрэзентацыі тэкставых катэгорый. У беларускім мовазнаўстве недаследаванымі выступаюць агульныя і ідыястылёвыя праявы праспекцыі і рэтраспекцыі, таму патрэба распрацоўкі кваліфікацыйных і класіфікацыйных характарыстык гэтых катэгорый, іх комплекснае вывучэнне відавочныя.

Навуковая навізна вынікаў дысертацыйнага даследавання В. П. Дзігадзюк у тым, што ўпершыню на матэрыяле беларускай мастацкай прозы – раманаў Уладзіміра Васільевіча Гніламёдава – рэпрэзентаваны катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі, вылучаны тыпы іх значэнняў: для праспекцыі – кампазіцыйна-тэкставая, сюжэтна-кампазіцыйная; для рэтраспекцыі – адсылачная, кампазіцыйна-тэкставая, сюжэтная. Саіскальнікам таксама ўстаноўлены іх віды (кантактная, дыстантная, фактычная, пазатэкставая); адносіны паміж праспектыўнымі і рэтраспектыўнымі кампанентамі (тоеснасці, уключэння, перасячэння, неадпаведнасці); прыёмы пабудовы (намінацыя рэтраспектыўных падзей, інфармацыйнае дапаўненне фактаў, супастаўленне і параўнанне падзей, прамая актуалізацыя мінулага); маркеры фарміравання часавага плану (часавыя формы дзеяслова, формы дзеепрыметніка, лексемы з указаннем на час). Дысертацыйнае даследаванне, такім чынам, спрыяе ўзбагачэнню метадалагічнай базы для вывучэння тэкставых катэгорый як інструмента аналізу моўнай сістэмы, для вызначэння заканамернасцей фарміравання ідыястыля пісьменніка, пабудовы агульных тэкстава–дыскурсіўных мадэлей.

У адпаведнасці з мэтай і задачамі ў дысертацыі сфармуляваны асноўныя палажэнні, што выносяцца на абарону, якія з'яўляюцца новымі, навукова абгрунтаванымі і даказваюцца ў ходзе даследавання.

Абгрунтаванасць і дакладнасць сфармуляваных у дысертацыі вынікаў і рэкамендацый забяспечаны кваліфікаванай апрацоўкай значнай колькасці валіднага фактычнага матэрыялу (1463 праспектыўныя і рэтраспектыўныя блокі) і надзейнай метадалагічнай базай -- у дысертацыі ўзяты за аснову тэатэтычныя прынцыпы лінгвістыкі тэксту (І. Р. Гальперын, А. У. Бандарка, Г. А. Золатава і інш.).

Аўтарэферат дысертацыі цалкам адпавядае ўзроўню навуковай кваліфікацыі на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук: змяшчае ўсе неабходныя структурныя часткі; мэта і задачы даследавання, палажэнні, што выносяцца на абарону, карэлююць з вынікамі даследавання. Анатацыя глаў дысертацыі ў аўтарэфераце дэманструе навукова-тэарэтычную паўнату зместу

работы, рэпрэзентатыўнасць фактычнага матэрыялу, глыбокае вывучэнне даследуемай праблемы.

Асноўныя палажэнні і вывады даследавання, а таксама сістэматызаваны, абагульнены і інтэрпрэтаваны фактычны матэрыял могуць быць выкарыстаны пры вывучэнні структурнай арганізацыі і семантычнага напаўнення іншых катэгорый мастацкага тэксту (персанальнасці, мадальнасці, лакатыўнасці, тэмпаральнасці і інш.), аналізе іх рэпрэзентатыўных адзінак, для распрацоўкі праблем тэорыі тэксту

Варта меркаваць, што большасць пытанняў, якія ўзнікаюць пры чытанні аўтарэферата, раскрыта ў паўнатэкставым варыянце дысертацыйнага даследавання. Але на адно з іх хацелася б атрымаць тлумачэнне. Чаму катэгорыя праспекцыі рэпрэзентуецца чатырма відамі логіка-семантычных адносін (тоеснасці, перасячэння, уключэння і неадпаведнасці), а рэтраспецыя – двума (тоеснасці і ўключэння)?

Дысертацыя В. П. Дзігадзюк з'яўляецца завершаным кваліфікацыйным даследаваннем, змяшчае новыя, навукова абгрунтаваныя вывады, якія вырашаюць актуальную навуковую праблему дыферэнцыяцыі і інтэрпрэтацыі катэгорый мастацкага тэксту, а яе аўтар заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова.

Доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры сучасных тэхналогій перакладу
Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта     Н.Ю. Паўлоўская

Учреждение образования
"...СКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЛИНГВИСТИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ"
Н. Ю. Павловской
УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела кадров МГЛУ
Г. Н. Кузьмич
09 2023